УДК 728.03(392)

# Семантыка і функцыянальнасць тэрміна "акно" ў народнай будаўнічай традыцыі Беларусі

Шэстак Ю.Т.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

У традыцыйным народным дойлідстве Беларусі аконныя праёмы, паступова развіваючыся з вентыляцыйна-светлавой адтуліны і валакавога акна, сталі з'яўляцца важнымі элементамі жылога зруба, часта падкрэсленымі сціплым ці развітым аздабленнем. Прычыны, па якіх абіраліся наяўнасць, тая ці іншая колькасць і дэкор, былі абумоўленымі не толькі практычнымі патрэбамі, але і ў пэўнай ступені семантычна прынятай функцыяй акна як часткі мікракосма жытла – паводле правілаў, характэрных для культуры «рытуальнага» тыпу.

Акно шырока фігуруе ў вуснай народнай творчасці: песнях, казках, прыказках. Важнасць яго ролі выразна падкрэсліваюць выпадкі, калі сам дом у тэксце метанімічна абазначаецца праз акно. Асабліва часта гэты элемент-сімвал згадваецца ў тэкстах пахавальнай абраднасці, дзе дом жывога чалавека супрацьпастаўляецца тагасветнаму дому, як месцу яго вечнага прытулку і супакаення, адваротным чынам арганізуючы іх структуру і прастору. Таму труна апісваецца як цёмная хата, пазбаўленая вокнаў. Адпаведна, у традыцыйным дойлідстве ў адрозненне ад сучаснага, дом для жывых гаспадароў не мог функцыянаваць без аконных праёмаў.

Момант усталявання акна звычайна абыгрываўся рытуальна і нёс дадатковы сэнс. Напрыклад, на Брэстчыне вокны закладалі на трэці дзень трэцяй нядзелі пасля маладзіка, каб хата не замярзала зімой.

Характэрнай асаблівасцю сялянскага дома была наяўнасць трох вокнаў: адно рабілася ў тарцовай сцяне і два ў падоўжнай. Чацвертае акно ў глухой сцяне праразалася толькі ў некалькіх раёнах Беларусі. Звычай мець у хаце тры акна звязваецца з святой Троіцай, таму большая колькасць вакон рабілася толькі ў выключных выпадках: з дабраславення святара і дазволу вясковага сходу. Пры гэтым для калядных песень як носьбітаў дахрысціянскай традыцыі, таксама характэрны вобраз церама менавіта з трыма вокнамі, у якія бачныя чырвонае сонца, ясны месяц, дробныя зоры.

Акно ў фальклорных тэкстах супрацьпастаўляецца дзвярам (рэгламентаванае выйсце), праз яго адбываецца кантакт са звышнатуральным светам. Па гэтай прычыне шырока распаўсюджваецца аздабленне ліштваў і аканіцаў разьбой, якая акрамя дэкаратыўных задач звычайна выконвае функцыі абярэга. Таксама пры гэтым з'яўляецца характэрны для традыцыйнай архітэктуры эстэтычны кантраст паміж плоскасцю сцяны або франтона і дробнымі дэталямі ўпрыгожвання акна.